Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. У панядзелак у нефармальнай абстаноўцы можна будзе вырашыць значныя праблемы. Перад вамі адкрыюцца новыя магчымасці. У сераду не варта шмат размаўляць, асабліва з тымі, каго не вельмі добра ведаеце. Лепш не афішыруйце свае планы, дзейнічайце ціха, і поспех будзе на вашым боку. У нядзелю не трэба раздаваць указанні і выказваць крытычныя заўвагі блізкім.

ЦЯЛЕЦ. Вакол вас дакладна ўздымаецца вецер перамен. Цалкам магчыма, што ён панясе ад вас непатрэбных людзей і лішнія праблемы. Калі штосьці трывожыць у адносінах з калегамі або сваякамі, лепш знайсці ў сабе сілы і карэктна задаць пытанне на тэму, якая вас цікавіць. У чацвер аб'ём работы можа злёгку напалохаць, але зоркі супакойваюць: вы бліскуча справіцеся з усім, а вашы намаганні акупяцца з лішкам.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні можаце нічога не планаваць, а прытрымлівацца закліку сэрца і інтуіцыі. Менавіта так даможацеся таго, што трэба і ў працы, і ў асабістым жыцці. Удасца адстаяць свае перакананні і інтарэсы. Да таго ж вы пераканаецеся, што кахаеце і каханыя. Ваш выбраннік зробіць усё, каб быць з вамі.

РАК. Тыдзень можа быць вельмі ўдалы ў плане працы і фінансаў. Вам застаецца толькі згладзіць некаторыя няроўнасці. Паспрабуйце максімальна выкарыстоўваць таленты, але не вельмі цягніце коўдру на сябе. І начальства ацэніць вашы намаганні. Дарэчы, парады сяброў дапамогуць знайсці аптымальны спосаб рашэння важнай праблемы.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні душа будзе патрабаваць рамантыкі, у той час як зоркі настойліва рэкамендуюць праявіць як мага большую практычнасць ва ўсіх абласцях. Лёс можа падарыць новае знаёмства, але не варта думаць, што гэта ваша самае вялікае каханне. У любых справах і адносінах шукайце для сябе карысць. Альтруізм не прынясе толку ні вам, ні таму, для каго будзеце старацца. У сераду пастаўцеся сур'ёзна да новай дзелавой прапановы, яна можа адкрыць неблагія перспектывы. У суботу правядзіце рэвізію ў шафе і вызваліцеся ад лішніх рэчаў.

ДЗЕВА. У панядзелак варта дараваць сваім блізкім іх невялікія слабасці, не ўсе ж валодаюць вашай настойлівасцю і ўменнем імкнуцца да мэты. Да серады будзеце захопленыя ўсім чым заўгодна, але толькі не хатнімі абавязкамі. Але немагчыма бясконца ўвільваць ад рашэння важных пытанняў. У канцы тыдня лепш не строіць планы, бо рэальная сітуацыя ўсё роўна іх парушыць. Субота — спрыяльны дзень для культурнага адпачынку, паходаў па тэатрах або выстаўках.

ШАЛІ. Выбраўшы правільную стратэгію і прыклаўшы намаганні, вы нарэшце даберацеся да лаўровага вянка. А калі будзеце ленавацца, то дастанецца толькі лазневы венік. Выбіраць вам. У аўторак патрэбная інфармацыя, нібы залатая рыбка, сама прыплыве вам у рукі. Калі прапусціце, будзе ўдвая крыўдна. У сярэдзіне тыдня не звяртайце ўвагі на шэпт за спінай і зайздросныя ўздыхі: сканцэнтруйцеся — і наперад, прама да мэты. У нядзелю можна пайсці на спатканне.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні будзеце асабліва паспяхова спраўляцца са сваімі і чужымі праблемамі. Так што не цягніце, сячыце гордзіеў вузел, мяняйце сваё жыццё да лепшага. Вы будзеце поўныя разнастайных ідэй і зможаце хутка іх рэалізаваць. Праяўляйце ініцыятыву і даможацеся многага ў справах і ў каханні. У канцы тыдня вам дакладна будзе што адсвяткаваць.

СТРАЛЕЦ. На гэтым тыдні непазбежныя змены як у рэжыме працы, так і ў ладзе жыцця, будзьце больш сціплымі, умейце здавольвацца малым. У сераду чакайце пахвалы ад начальства і прэміі, вашы намаганні ацэняць. У пятніцу адкрыецца другое дыханне, і зможаце горы звярнуць. Але ў выхадныя лепш адпачываць, а не працаваць.

КАЗЯРОГ. Ганіце прэч восеньскую дэпрэсію. Ваш кіслы выгляд можа надоўга сапсаваць настрой навакольным. Выбірайце аб'ём працы па сілах, не адмаўляйцеся ад дапамогі калег. Магчыма не зусім прыемная размова з начальнікам, якая скончыцца канкрэтным рашэннем. Адганяйце трывожныя думкі, зоркі не пакінуць вас без заступніцтва.

ВАДАЛІЎ. Спрыяльны перыяд прынясе новыя кар'ерныя магчымасці, варта максімальна імі скарыстацца і працаваць не складаючы рук, тады вынікі перавысяць усе вашы чаканні. Прафесійная актыўнасць дасягне высокага ўзроўню, з'явяцца прапановы з нагоды новай працы, і гэта дазволіць вам выйсці на новы фінансавы ўзровень. Аднак важна не задзіраць нос і не забывацца пра блізкіх.

РЫБЫ. На гэтым тыдні заканчваецца перыяд цяжкасцяў і стрэсаў, павінна наступіць прыкметнае пацяпленне ў вашых адносінах з фартунай. Ёсць шанц атрымаць жаданае і зрабіць вялікі крок наперад пасля складанага перыяду таптання на адным месцы. У пятніцу праца адцягне ад беспаспяховага высвятлення адносін. У выхадныя ўдзяліце час родным. Ім патрэбна ваша падтрымка.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.01	19.01	12.00
Віцебск —	6.50	18.50	12.00
Магілёў —	6.51	18.51	12.00
Гомель —	6.47	18.47	12.00
Гродна —	7.16	19.16	12.00
Брэст —	7.17	19.17	12.00

Месяц

Поўня 21 верасня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Сямёна, Фёдара, Юльяна.*
К. *Амеліі, Аўрэліі, Сяргея, Уладзіслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

25 ВЕРАСНЯ

У краіне

1765 год — нарадзіўся Міхал Клеафас Агінскі, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, кампазітар. З 1789 года надзвычайны пасланнік у Галандыі. Пасол на Чатырохгадовы сейм 1788—1792 гадоў і Гродзенскі сейм 1793 года. Падтрымліваў Канстытуцыю 3 мая 1791 года Пасля перамогі Таргавіцкай канфедэрацыі эмігрыраваў у Прусію. Падчас паўстання 1794 года ўваходзіў у склад паўстанцкіх органаў улады ў Літве і Беларусі, сфарміраваў на свае сродкі батальён конных егераў, камандаваў ім у некалькіх бітвах. Пасля падаўлення паўстання эмігрыраваў. У 1802 годзе вярнуўся на радзіму па амністыі і жыў у маёнтку Залессе каля Смаргоні. З 1810 года сенатар, прадставіў імператару Аляксандру I праект адраджэння ВКЛ на правах аўтаноміі на чале з намеснікам імператара і са сталіцай у Вільні. З 1823 года жыў у Фларэнцыі. Аўтар паланэзаў для фартэпіяна, асабліва папулярны паланэз «Развітанне з Радзімай». Пісаў маршы, вальсы, мазуркі, менуэты, рамансы.

1971 год — адкрыты мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Архітэктурна-скульптурны ансамбль мемарыяла ўключае манументальны галоўны ўваход у выглядзе зоркі, прарэзанай у бетонным блоку, галоўны манумент «Мужнасць», штык-абеліск, скульптурную кампазіцыю «Смага», плошчу Цырыманіялаў, тры рады манументальных пліт з пахаваннямі загінулых, тэрасы-трыбуны, руіны і ацалелыя збудаванні крэпасці, музей. Кампазіцыйным цэнтрам з'яўляецца галоўны манумент — абагульнены вобраз воіна-пераможцы і штык-абеліск.

1996 год — для стабілізацыі гідралагічнага рэжыму рэк Нёман і Уша ў Карэліцкім раёне створаны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння Міранка. Частку заказніка займае тарфяное радовішча Ваўчынае Балота.

У свеце

1513 год — іспанскі канкістадор Васка дэ Бальбоа са сваім атрадам перасёк Панамскі перашыек і стаў першым еўрапейцам, які дасягнуў Ціхага акіяна.

1818 год — англійскі ўрач Джэймс Бландэл правёў першую ў свеце паспяховую аперацыю па пераліванні крыві ад чалавека да чалавека.

1881 год — нарадзіўся Лу Сінь, кітайскі пісьменнік, заснавальнік сучаснай кітайскай літаратуры.

1906 год — нарадзіўся Дзмітрый Дзмітрыевіч Шастаковіч (1906—1975), савецкі кампазітар, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. Ганаровы член многіх замежных акадэмій, ганаровы доктар Оксфардскага ўніверсітэта. Продкі кампазітара паходзяць з Вілейшчыны. Аўтар 15 сімфоній, опер, балетаў, араторый, аперэт і інш. Д. Шастаковіч неаднаразова прысутнічаў на прэм'ерах сваіх твораў у Мінску.

Так гаварыў...

МАКІЯВЕЛІ:

«Кожны бачыць, як ты выглядаеш, мала хто адчувае, хто ты ёсць».

УСМІХНЕМСЯ

— Ну, што за жыццё! Адны непрыемнасці! На рабоце — вымову, сын двоечнік, жонка запіла, а тут яшчэ сусед «мерседэс» купіў...

«Вы выпускаеце выключна арыгінальныя пікантныя сыры. Чаму?» «Наша вытворчасць размешчана ў памяшканнях былых ачышчальных збудаванняў. Першыя паўгода мы спрабавалі змагацца з гэтым пахам, але потым вырашылі пайсці іншым шляхам».

Заходзіць мужык у спартыўную краму і цягне за сабой парашут. Падыходзіць да прадаўца і кажа: «А вы ведаеце, што вашы парашуты не раскрываюцца?» «Дзіўна, вы першы, хто нам паскардзіўся».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2359. Нумар падпісаны ў 19.30 24 верасня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12